




# БЕЛАРУСКІ КАЛЕКЦЫЯНЕР

Выданьне Арганізацыйнага камітэту Беларускага таварыства калекцыянераў ♦ № 2 1991 г.





## ЗЬ ЯГО ПАЧЫНАЛАСЯ АДРАДЖЭНЬНЕ

26 лістапада мінулага года споўнілася 60 гадоў з дня нараджэньня У. С. Караткевіча. Сёньня Караткевіча па праву завуць паэтам і пісьменьнікам, драматургам і публіцыстам. Але перш за ўсё ён быў змагар. Ён быў з кагорты тых яшчэ нешматлікіх рупліўцаў адраджэньня беларускай нацыі, якія супрацьстаялі націску велізарнай антынароднай, антыбеларускай машыны маскоўскага цэнтру.

Мы яшчэ, напэўна, да канца не разумеем усяго таго, што зрабіў Караткевіч для Беларусі. Бо ягоная праца – гэта праца не толькі пісьменьніка, не толькі зьбіральніка і апісальніка нашай гісторыі. Ён зрабіў нешта большае. Сваім жыцьцём, сваёй творчасцю, сваімі кніжкамі ён абудзіў сотні, тысячы беларусаў да нацыянальнага жыцьця. Ён падаваў нам прыклад, як трэба працаваць на карысьць Беларусі. Вучыў шанаваць сваю гісторыю і ведаць яе. Бараніў нашы помнікі і мову. Былі і такія выпадкі, калі ён адзін бараніў гонар нашай Бацькаўшчыны. У тыя часы, калі шмат хто згубіў усялякую надзею, ён прымушаў верыць у наша адраджэньне. У магчымасьць стварэньня сваёй уласнай дзяржавы. У атрыманне сапраўднай незалежнасьці.

І тыя сьціплыя сьвяткаваньні якія праходзілі на Беларусі ў гонар 60-годдзя нараджэньня У.С. Караткевіча, – гэта толькі пачатак той вялікай даніны, якую аддае беларускі народ свайму вернаму сыну.

Але ўшанаваньне памяці Уладзіміра Сямёнавіча пачалося ня сёньня. Яно пачалося, напэўна, з таго сьціплага значка, які быў выраблены ў Маладэчне. Праз год пасьля сьмерці паэта. Аўтар гэтай адзнакі – мастак Герасіменка. А наклад яго ўсяго 230 паасобнікаў. Сёньня гэта даволі рэдкі значок, і мы таксама не маем яго выяву. Але спадзяемся на дапамогу ў яго набыцьці і абавязкова азнаёмім з ім нашых чытачоў.

Трэба яшчэ адзначыць, што першы на Беларусі музей-гасцёўня імя Караткевіча таксама зьявіўся ў Маладэчне дзякуючы намаганьням нацыянальна-сьвядомай моладзі і асабістай працы спадара Міхася Казлоўскага.

У Воршы да 60-годдзя Ул. Караткевіча накладам 1000 асобнікаў выраблены значок, які распаўсюджваўся сярод гасцёў і ўдзельнікаў святочных мерапрыемстваў.

Ёсьць яшчэ адзін значок з выявай Караткевіча, выраблены менскімі каапeратарамі. Праўда, мастацкі бок апошніх значкоў пакідае жадаць лепшага. Але, як бы там ні было, пачатак пакладзены. І мы спадзяёмся, што ў далейшым памяць Караткевіча будзе ўшанавана і на належным мастацкім узроўні.

Б. К.





Экслібрыс Ул. Караткевіча з калекцыі А. Сімановіча.

Значкі, прысвечаныя Уладзіміру Караткевічу.

## МЕДАЛЬ ЗА ЗДРАДУ

Уладзімір Сымонавіч Караткевіч вывучаў, ведаў і любіў гісторыю нашае Беларусі. У сваіх шматлікіх падарожжах па радзіме ён абавязкова наведваў гістарычныя мясьціны, аглядаў помнікі нашага дойлідства, занатоўваў цікавыя ўспаміны мясцовых жыхароў. Вось урывак з успамінаў У. С. Караткевіча, які шмат пра што гаворыць: „Аб'езьдзіў па Палесьсі Піншчыну і Століншчыну (гэта ў мяне плян на некалькі год: ведаць ня толькі, скажам, Карэлію ці Сярэднію Азію, хай хоць няпоўна, але сваю Беларусь схадзіць да апошняе вёскі, леса, урочышча. Зараз прыехаў на некалькі дзён у Менск, а хутка паеду з тым жа ў Карэліцкі і Навагрудскі раёны. Гіне старая Беларусь. Трэба фатаграфаваць і апісваць старыя цэрквы, касьцёлы, капліцы, хаты, адзеньне, краявіды, якія пахабяць з кожным годам".





Вяртаючыся з сваіх вандровых дамоў, Караткевіч абавязкова прывозіў якуюнебудзь цікавую старую рэч. Тыя, каму пашчасьціла бываць на кватэры пісьменніка, прыгадваюць, што яна нагадвала маленькі краязнаўчы музэй. Але такое ўражэньне складвалася толькі у людзей незнаёмых з творчым працэсам пісьменніка. Справа у тым, што усе гэтыя рэчы дапамагалі Караткевічу пісаць свае цудоўныя творы. У лісьце да Максіма Танка ён піша: „ У мяне дурная прывычка трымаць у руках рэч тых часоў, пра якія пішаш. На ёй добра канцэнтраваць думку. Зараз у мяне ў руках медаль. Мне да яго адразу падмалёўваецца вобраз чалавека, які яе атрымаў, а потым і таго, каго ён выдаў. Уявіце сабе кірмаш, натоўп. Недзе ў гэтым натоўпе ходзіць інсургент, пераапрануты ў сялянскую вопратку, былы пан, які прakляў сваё панства. Тут жа пераапрануты правакатар. Трэба неяк паказаць жандарам каго трэба хапаць. І правакатар падыходзіць і, як пану, цалуе інсургенту руку. Схапілі.

У сваім лісьце Караткевіч падае выяву гэтага медаля. Гэта вядомы медаль „За усміреніе польскаго мятежа 1863–1864", выяву якога мы і прыводзім. Дададзім, што гэты медаль сустракаецца як у жоўтым, так і ў белым метале. І хоць прайшло ўжо шмат гадоў, але яны даволі часта сустракаюцца. І ёсць у калекцыях нават пачынаючых нумізматаў. Напэўна, тагачасны расейскі ўрад не шкадаваў гэтых сваіх узнагародаў.

А. С.

## Равесьнікі рэспублікі

У маёй філатэлістычнай калекцыі, прысвечанай Беларусі, ёсць маркі, якія па праву лічацца равеснікамі рэспублікі. Гэта маркі мясцовых выпускаў, так званыя мясцовыя правізоры, выдадзеныя паштовымі канторамі некоторых гарадоў Беларусі ў пачатку 20-х гадоў, адзін з самых цікавых перыядаў у гісторыі савецкай філатэліі і, бадай, адзін з слаба вывучаных. Ніжэй я прывяду доказы, што гэта менавіта так.

У вядомым каталогу паштовых марак перыяду грамадзянскай вайны ў Расіі, які належаў Ф. Чучыну, апісаны мясцовыя выпускі марак у Мінску, Рагачове (Мінская губерня), Себежы і Суражы (Віцебская губерня). Гэты каталог быў выдадзены ны ў 1927 годзе і з той пары ні разу не перавыдаваўся, таму што ў ім няма знаходак беларускіх філатэлістаў апошніх гадоў. А знаходкі гэтыя цікавыя.

Чытачы „Голасу Радзімы" пазнаёміліся з гісторыяй выпуску мясцовых марак на тэрыторыі Беларусі ў маім артыкуле „Беларускія правізоры", апублікаваным у 1978 годзе. Сёння гэтыя даныя я хачу дапоўніць. Па каталогу Чучына лічылася, што мясцовыя правізоры існавалі толькі ў чатырох гарадах Беларусі. Аднак некалькі гадоў назад у адным з сямейных архіваў у горадзе Рызе быў знойдзены стары канверт ад пісьма, высланага ў Рыгу з Дрысы (сёння Верхнядзвінск) Віцебскай губерні 1 кастрычніка 1922 года. На ім былі выяўлены маркі, да сёння невядомыя савецкім філатэлістам і не апісаныя ні ў адным каталогу. На марках царскай Расіі паштавікі Дрысы паставілі надпячатку чорнага колеру „Дрыса", пераацаніўшы такім чынам маркі старога ўзору. Гісторыя гэтага мясцовага выпуску не даследавана, на многія пытанні няма адказу, бо невядома, якія наміналы старых марак былі пераацэнены ў Дрысе, як доўга імі карысталіся і г. д. Адказаў на пытанні няма, а тут новая знаходка – правізорыя невялікага гарадка на Дняпры – Холмеч Мінскай губерні (цяпер Гомельская вобласць). Беларускім філатэлістам сталі вядомы маркі старога ўзору, г.зн. царскай Расіі, з чорнай надпячаткай літары „Р" („рублёў" – усе маркі пераацэньваліся ў той час у рублёвы кошт). З'явілася яшчэ адна тайна беларускіх мясцовых выпускаў.

Леў КОЛАСАЎ.
(„Голас Радзімы", № 27, 6 ліпеня 1989 г.)



# БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАТЭЛІЯ?





А што гэта такое – беларуская філятэлія? Якія ў яе здабыткі, аўтарытэт, творчы патэнцыял? Леў Коласаў рэгулярна публікуе інфармацыю пра свае – часам вельмі каштоўныя – паштовыя знаходкі, зьвязаныя з Беларусьсю. Есьць і іншыя, хто „зьбірае беларускую тэматыку". І ўсё ж . . . Калі філятэлія – гэта частка культуры, калі гэта адзін са спосабаў самаарганізацыі духоўнага жыцьця нацыі, дык у плыні беларускае культуры няма такога струменьчыку – беларускае філятэліі. БЕЛАРУСКАЕ ФІЛЯТЭЛІІ НЯМА.

І хай ня крыўдзяцца на мяне філятэлістычныя кіраўнікі беларускага аддзяленьня ўсесаюзнага таварыства. Бо няма галоўнага, таго, што стварае нацыянальную філятэлію, шматжанравую і шматтэмную; што стварае дух нацыі, у філятэліі для ўсяго сьвету выражаны: няма свае эмісіі знакаў паштовай аплаты. Нармальная нацыя здольная арганізаваць уласную паштовую сувязь, вылучыць з сябе выдаўцоў ды аўтараў знакаў паштовай аплаты і – тады ўжо – іх зьбіральнікаў, якіх легіён.

Мы ж нацыя ненармальная, хворая. Мы рупліва зьбіраем каліва да каліва – савецкія, польскія, літоўскія мініятуры, што хоць бокам кранаюць (або й прыпісваюць сабе) беларускую гісторыю, беларускіх дзеячоў. Ці задумваліся мы, што іншыя каленіі – хоць бы Брытанская Гвіяна або Маўрыкіус у свой час – мелі свае, і знакамітыя, паштовыя выпускі!. . Наш жа статус ніжэйшы за каляніяльны.

Прадмет гонару нашых збораў – ведамыя 8 БНР-аўскіх познамак 1918–1920 гадоў (ужываю тэрміны В. Ластоўскага: марка – познамка, значок – адзнака, конверт – агортка). Але ж афіцыйная філятэлія нібы запраграмаваная на зьняваґу „недзяржаўных народаў". Да гэтых унікальных выпускаў, што сьведчаць і за нашую здольнасьць да незалежнага быцьця, і пра разуменьне нашымі тагачаснымі дзеячамі ролі сьціплае познамкі ў культуры й палітыцы, клеяць тэрміны-ярлыкі: „фантастычныя", „эфэмэрныя" . . . Бо ці прайшлі яны пошту – дагэтуль няведама, але ясна: калі і не прайшлі, дык вінаваты ў гэтым бальшавіцкі бот, што растаптаў нашую маладую незалежнасьць.

Я – не за правінцыйную аматаршчыну і не адмаўляю сусьветна прынятых правілаў калекцыянаваньня. Мне йдзецца аб іншае. Беларусь як краіна ў сучаснай філятэліі не існуе, дакладней, існуе як Северо-Западный край, аднаго рангу з Тамбоўскай вобласьцяй. Гэта абразьліва тым больш, што Беларусь (у адрозьненьне, прыкладам, ад Літвы) – сяброўка Сусьветнага Паштовага Саюзу; пра гэта, дарэчы, інфармуе вядомая познамка й агортка з тэкстам па-беларуску. Але філятэлістычнае жыцьцё * люструе аб'ектыўнае становішча – наш ніжэйшы за каляніяльны статус . . . І мы пакорліва дзякуем Маскве, што раз на год-два тая ўзгадае пра „Северо-Западный" на познамках, што выдасьць чарговую агортку з выяваю ЦК КПБ ці Паркавай-Машэрава (нібыта іншых вартых увагі архітэктурных аб'ектаў у нас няма). Не заўважаем, што дружная маскоўская каляфілятэлістычна-мастакоўская кампанія без праблемаў і закідаў сумленьня малюе познамкі, агорткі, рэжа штэмпелі спэцгашэньня на тэмы хоць эстонскія, хоць якуцкія і падазрона падобныя. Мала таго – адкрыта халтурыць (памятаеце пачварныя аблічы, прыпісаныя Купалу й Коласу на гашэньнях 1962 году?) і адкрыта зьневажае нашую нацыянальныя пачуцьці (на матэрыялах, прысьвечаных Скарыну, не знайшлося радка пра тое, што ён беларус, на штэмпелях і познамцы няма слова па-беларуску). Інакш быць не магло й ня можа, бо мы маўчым.

Ва ўсім сьвеце пошта слухае філятэлістаў, бо пошце, як дзяржаўнаму ведамству, гэта – і сувязь з грамадзкасьцяй і фармаваньне рынку. Цікава даведацца, як часта, з якімі прапановамі ды якімі фармулёўкамі зьвярталася БССР-аўская філія ўсесаюзнага таварыства ў Мінсувязі БССР і якія мела адказы. Але гэта ўжо ня так істотна. Настаў іншы час. Літва і без Сусьветнага Паштовага Саюзу аднавіла філятэлістычную традыцыю. Мінсувязі мусіць неадкладна эмітаваць прынамсі агорткі. Паліграфічную базу маем. Маем мастакоў, што жывуць у нацыянальнай графічнай традыцыі, што плённа працуюць у малых жанрах. Ня маем – маральнага права прамінуць магчымасьць на нашых мініятурах зарабіць крыху валюты (кормяцца ж з гэтага Ліхтэнштэйн ды Сан-Марына) і ўрэшце ўбіць сьвету ў галаву, што ёсьць такая зямля Беларусь.

Тады мы і загаворым пра філятэлію, і каталёгі выпусьцім, прычым нумарацыя пачнецца ад БНР-аўскіх познамак. Паколькі бальшавікі для Беларусі і ад яе імя не выдавалі, эсэсэраўскі матэрыял у каталёг ня ўвойдзе. Затое ўвойдуць эміграцкія – амэрыканскія ды ангельскія – выпускі: філятэлістычны патэнцыял нашае нацыі быў выціснуты ў эміграцыю; асобныя сэрыі прайшлі нават пошту падчас страйку ангельскіх паштароў як замена. Асобным падлікам уключым Сярэднюю Літву – марыянэткавую дзяржаву на тэрыторыі Заходняе Беларусі, якая выпусьціла некалькі сэрыяў на віленскую тэматыку; будзе ў каталёгу і некалькі апісаных Коласавым БССР-аўскіх наддрукаў.

Хачу прапанаваць газэце стаць ініцыятарам стварэньня Зьвязу беларускіх філятэлістаў. Першаю акцыяй зьвязу сталася б распрацоўка тэматыкі паштовых выпускаў Беларусі. Падзеі трэба апярэджваць і не даваць кіраваць імі выпадковаму неабазнанаму чыноўніку. Маю першыя прапановы: „Геральдыка Беларусі" – мастак Яўген Кулік, „Беларуская готыка" – мастак Уладзімер Басалыга. Давайце працягнем шэраг.

Што ж зьбіраць, пакуль тое будзе? А хоць бы сусьветную „albaruthenica": познамкі, агорткі, цэльныя рэчы, гашэньні, картмаксымумы. Дасьледваць гісторыю пошты на Беларусі. Шукаць новае. Анатоль Гурыновіч, прыкладам, акрамя таго што намесьнічае ў Менскім гарсавеце, зьбірае стандартныя гашэньні з этнанімічнымі тапонімамі Беларусі (Крывічы, Гудзевічы – ад літоўскай назвы беларусаў „гудай" – і пад.) Але найважнейшае – зрабіць крок ад філятэліі паняволенае да філятэліі жывой.

Вінцук ВЯЧОРКА.

*АД РЭДАКЦЫІ:*

*Мы цалкам падтрымліваем Вінцука Вячорку ў тым, што маркі Беларускае Народнае Рэспублікі ў сучаснай савецкай філятэліі разглядаюцца як фантастычныя. Менавіта гэтак ахрысьціў іх Чучын у сваім вядомым каталягу паштовак марак і цэльных рэчаў „Гражданская война в России", выдадзены ў 1927 годзе. Але гісторыя, як бы яе не хавалі, ўсё роўна знаходзіць шлях да сьвятла, да праўды. Сёньня нават часопіс „Филателия СССР" не адмаўляе таго, што сэрыя марак БНР „Асобны атрад" мела паштовае хаджэньне.*

*У адзінаццатым нумары часопіса „Филателия СССР" за 1989 год Брэйман у артыкуле „Фантастыка ці рэальнасьць" піша: Нельга пагадзіцца з высновамі ў адносінах марак „Асобнага атрада" ў тым, што гэты выпуск зьяўляецца сьпекулятыўным выданьнем".*

*Далей ён піша: „У прыватнасьці ў ленінградскага калекцыянера Флітеуда ёсьць паштоўка з маркай „Асобнага атрада", прайшоўшая пошту, сапраўднасьць якой бясспрэчная". Дададзім, што і ў беларускіх філятэлістаў ёсьць маркі „Асобнага атрада" з адбіткам паштовага штэмпеля. Можа калі-небудзь удасца адшукаць і астатнія маркі Беларускае Народнае Рэспублікі, прайшоўшыя пошту.*

* Філятэлістычнае жыцьцё, ня намі арганізаванае; у ягоных правілах – паблажлівасьць нават да філятэлістычных спробаў псэўдасувэрэнных савецкіх рэспублік. Параўн. рэкамендацыю да афармленьня спэцгашэньня: „Пры наяўнасьці некалькіх відаў адумысловых агортак пажадана найперш выкарыстоўваць агорткі г. зв. афіцыйнага „паштовага выданьня" – выданьня Міністэрства сувязі СССР, затым выданьні мясцовых упраўў сувязі або Міністэрстваў сувязі саюзных рэспублік . . ." (ВОФ. Специальные почтовые штемпеля СССР 1922–1972 г.г. Автор-составитель В. А. Якобс. М., „Связь", 1976. С. 378).

## Беларуская пошта – ці беларуская яна?

ДОСТАВКА ОПЛАЧЕНА
Ц № Витебск
ЦЕННАЯ БАНДЕРОЛЬ
на сумму (сумма цифрами и прописью)
КУДА 3 № 230 МИНСК 131
КОМУ 3 N 6 КОЗЛОВИЧИ
Индекс предприятия связи и адрес отправителя
Вес
Сбор
(подпись)
От кого II N 535 ГУДЗЕВИЧИ
Витобтип. Зак.

*Каб адказаць на гэтае пытаньне, просім шаноўных чытачоў паглядзець на гэтыя паштовыя адбіткі, зробленыя на афіцыйным бланку. Ці не праўда, калі меркаваць па гэтых штэмпелях, то няма ніякай розніцы паміж Віцебскам і Тамбовам, паміж Менскам і Калугай. Няма Беларусі.*

*Але, як нам сказалі на пошце, двухмоўныя паштовыя штэмпелі ёсьць, але імі не карыстаюцца. Але не карыстаюцца, на нашу думку, усё па той жа агульнавядомай прычыне... Бо паштовы канвэрт, марка, штэмпель – гэта візітная картка любога народа, любой дзяржавы. І менавіта па гэтых атрыбутах пошты можна меркаваць, як дзяржава ставіцца да сваіх народа.* Б К

# МЭДАЛІ–ЗМЕЯВІКІ

*З кнігі Вацлава Ластоўскага „ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ (КРЫЎСКАЙ) КНІГІ", выдадзенай у Коўне ў 1926 годзе.*



Мэдаль-зьмеявік ст. з Менскага Палесься.

Увесь сьветагляд Крывічоў да прыняцьця хрысьціянства быў не хрысьціянскі, а паганскі; але гэты сьветагляд быў народны. Хрысьціянкі-ж сьветагляд быў наадварот не народны (калі і былі ў ім рысы нацыянальныя, то прыналежалі яны чужой народнасьці, перш за ўсё – грэка-візантыцкай і тым каторыя ўссалі ў сябе гэтае грэка-візантыцтва). Гэткім чынам, з прыняцьцем хрысьціянства пачаўся ў нас выпрацоўвацца новы, хрысьціянскі сьветагляд на падвойнай аснове: на старавечна-народнай і хрысьціянскай. Зрэшты ў першыя часы да хрысьціянства належала толькі горстка гарадзкога жыхарства, шырокія масы толькі за некалькі сот гадоў маглі пранікнуцца хрысьціянствам і то – галоўным чынам зьнешнімі яго формамі, ўліваючы ў гэтыя зьнешнія формы паганскі зьмест. Хрысьціянскія сьвяты прыймаліся гэтай шырокай масай па аналегіі з паганскімі сьвятамі, хранолёгічна блізкімі з першымі. На хрысьціянскіх сьвятах пераносіліся рысы паганскіх багоў, гэтак на прарока Ільлю, дзень якога сьвяткуецца 20 ліпеня, перанесены былі рысы Пяруна, бога г рому; на сьв. Юрыя (23 красавіка), – рысы Ярылы; на сьв. Власія – рысы бога Велеса і г. д.

Паганства ў асобе валхвоў, чараўнікоў, варажбітаў доўга з магалася за сваё істнаваньне, аб гэтым сьведчаць адрыўкі летапісаў. Але ў паганства было што раз менш кіраўнікоў, і яно павінна было адступаць перад граматным хрысьціянскім духавенствам. Адступаючы, паганства мяшалася з хрысьціянствам. Прапаведнікі-грэкі, а пасьля духавенства мясцовага паходжаньня на працягу некалькі першых стагодзьдзяў грамяць „хрыстіан двоеверно живущих", асуджаюць тых, хто мае па дзьве жаны; гоняць за тое, што жон бяруць з танцамі, музыкай („плясаніем і гуденіем) і поклісканьмі; абураюцца тым, што складаюць жэртвы балотам, калодзяжам і бесам (г. зн.–паганскім багам). Але гэтыя пропаведзі былі бязсільны: паганскі сьветагляд быў у цеснай сувязі з жыцьцёвым укладам народных гушчаў.

Мэдалі-зьмеявікі паходзяць з кругабегу часу „двоеверства", калі і хрысьціянства прыймалі і паганскіх багоў не выракаліся. Гэткія „зьмеявікі" найбольш знаходзяць на Палесьсі. На адной старане такога „двоевернага" мэдалю бывае звычайна выбражэньне фігуры (ці фігур) сьвятога (або сьвятых), а на другой старане – міфічнага зьмея і зазвычай надпіс з жаданьнем шчасьця таму, хто яго носіць. Пададзены тут на рысунку бронзавы мэдаль-зьмеявік, знаходзіцца ў Беларускім музэі імені Івана Луцкевіча, ў Вільні. Знойдзены ён у Менскім Палесьсі і адносіцца да XII ст.

*(Мова і арфаграфія аўтара).*



Паштоўка, выдадзеная ў Нью-Ёрку Беларускім Інстытутам Навукі і Мастацтва. 1972 год.



Значкі, прысвечаныя 500-год дзю Францішка Скарыны.

# НОВЫЯ ЗДАБЫТКІ СКАРЫНІЯНЫ

Вялікім сьвятам у Полацку скончыліся ўрачыстасьці 500-угодкаў з дня нараджэньня Францішка Скарыны. Сьвята скончылася, пакінуўшы пасьля сябе шмат сувэніраў: значкаў, мэдалёў, паштовак. Калекцыянеры для сваіх калекцыяў прыдбалі шмат чаго з выявай нашага першадрукара.

Безумоўна, значнай падзеяй зьявіўся выпуск юбілейнага скарынаўскага рубля. Але існавала рэальная пагроза таго, што гэты рубель так і не пабачыць сьвету. Маскоўскія чыноўнікі цягнулі да самага апошняга. Адчувалася іх яўнае нежаданьне адзначыць 500-я ўгодкі беларускага першадрукара, па сутнасьці, расейскім юбілейным рублём.

У гэтым годзе была выпушчаная і паштовая марка з юбілейным канвэртам, а таксама паштоўка з выявай Францішка Скарыны. Трэба адзначыць, што на менскім паштамце праводзілася пагашэньне спэцыяльным штэмпелем скарынінскіх канвертаў.

Сёлета, таксама ўпершыню, у беларускай фалерыстыцы зьявіўся вобраз Францішка Скарыны. Выпушчана каля дзесятка памятных значкоў. З іх і пачнецца скарыніяна ў беларускай фалерыстыцы.

Нашы каапэратары таксама рыхтаваліся да юбілею друкара і вырабілі керамічны медаль з выявай асьветніка. Дарэчы, сучасны беларускі керамічны мэдаль ужо атрымаў сваю адметную назву. Сярод калекцыянераў ужываецца такі тэрмін, як нефармальны беларускі мэдаль. У гэтым ёсьць нейкі сэнс, бо ў асноўным вырабам керамічных мэдалёў займаюцца розныя нефармальныя арганізацыі.

Міністэрства фінансаў Беларусі ўпершыню праводзіла скарынаўскую латарэю. Хоць сам квіток і не вызначаецца нейкімі мастацкімі вартасьцямі, але ён займае сваё мейсца ў зборах беларускіх баністаў.

Трэба прыгадаць і памятны скарынаўскі мэдаль, якім былі ўзнагароджаны нашыя дзеячы навукі і кулььтуры. Але наклад яго настолькі малы, што беларускім калецыянерам застаецца толькі марыць пра яго.

Дык вось, калі да ўсяго гэтага дадаць тое, што было выдадзенае ў мінулыя гады з выявай Францішка Скарыны, дык атрымаецца неблагая калекцыя скарыніяны. Безумоўна, пры гэтым ня трэба забываць і нашую эміграцыю, бо там таксама выходзілі паштоўкі, маркі і значкі з выявай нашага славутага земляка.

Няхай жа вобраз Францішка Скарныны жыве ў нашых калекцыях і пашыраецца ў шматлікіх паштоўках, марках, мэдалёх вольнай Беларусі.

Алесь СЯРОЖКІН.



Мэдаль, выраблены кааператы вам „Вытокі".

## Знаходка ў Маскве

На пачатку 70–х гадоў мне неаднойчы даводзілася працаваць у Дзяржаўнай бібліятэцы СССР імя У. І. Леніна ў Маскве. Шмат перагарнуў даўнейшых кнігаў ды часопісаў, асабліва з 20-х гадоў – „Узвышша", „Крывіч", „Полымя", „Маладняк", кнігі В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, А. Смоліча, Ф. Турука й іншыя. Можна было ня толькі вольна заказваць і карыстацца імі, але й без перашкодаў здымаць копіі, тым часам як у Менску з гэтым, мякка кажучы, было няпроста. Чытаў нават „Працэс антысавецкага праватрацкісцкага блоку", выдадзены ў 1938 годзе на беларускай мове (праўда, зрабіць копію гэтае кнігі мне не дазволілі).

І вось аднаго разу, гартаючы часопіс „Наш Край" (1925–1930 г.г., шыфр XX 203/25, пазначаю яго дзеля большае пэўнасьці), я нечакана агледзеў на апошняй старонцы вокладкі круглы штэмпель з надпісам „Беларуская Дзяржаўная і Унівэрсітэцкая Бібліятэка". Заінтрыгаваны, я пасьля больш пільна прыглядаўся да чытаных выданьняў. Праз нейкі час у часопісе „Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсітэту" (1925, № 6–7, 8–10; 1926, № 11, 12; шыфр 419/123) гэтаксама на апошняй старонцы вокладкі, у левым верхнім ражку, выявіў штэмпель тае самае бібліятэкі з нумарамі адпаведна 262, 33, 435 і 714. Зазначу, дарэчы, што нідзе болей у тых паасобніках гэтакіх штэмпеляў не было – ні на тытульным аркушы, ні ў сярэдзіне. Прынамсі сьлядоў ад іх не засталося.

Мяне гэта надта зацікавіла, і пры сустрэчы з сп. Міколам Улашчыкам я папытаўся, што б яно магло значыць. Для яго ж такое не было навіною. Шмат гадоў працуючы ў бібліятэках, наш гісторык неаднойчы сустракаў рэдкія выданьні з аналагічным штэмпелям Ён выказаў меркаваньне што ў маскоўскіх кнігазборах яны маглі апынуцца пасьля ванйы, калі вярталася нарабаванае фашыстымі акупантамі багацьце нашых кніжнікаў. Але вярталася, паводле традыцыяў таталітарнае дзяржавы, праз цэнтр, дзе й заставалася.

Так гэта ці не, але бясспрэчна, што трапілі яны туды незаконным шляхам. А таму дасьледчыкам, энтузіястам варта распачаць сыстэматычную працу па выяўленьні ў маскоўскіх кнігасховішчах выданьняў з беларускіх збораў. Відаць, трэба таксама ўважліва прагледзець і архіў М. Улашчыка – там могуць быць карысныя зьвесткі. Праца гэтая няпростая, але высакародная. Уласнасьць народу мусіць быць вернутая на Радзіму.

З. Санько

# СТАРЫЯ БЕЛАРУСКІЯ МУЗЭІ

Вядомы беларускі навуковец Генадзь Каханоўскі шмат гадоў займаецца краязнаўствам. Гэтай жа тэме прысьвечана і ягоная новая кніга „Прадвесне навукі". У ёй аўтар сабраў цікавыя зьвесткі пра першапраходцаў у археалёгіі, цэлай плеядзе навукоўцаў мінулага часу, якія, дасьледуючы даўніну, раскрывалі таямніцы нашае гісторыі, разьвіцьця народа, асаблівасьці яго побыту і культуры. Прапануем адну главу з гэтае кнігі.

Ніводнаму народу не адмовіш у праве зьбіраць, вывучаць, а ў рэшце рэшт і ганарыцца помнікамі сваёй гісторыі. На такое права даўно прэтэндуюць і беларусы. Менавіта мова і гістарычная памяць доўгі час ратавалі наш народ ад дэнацыяналізацыі і выміраньня. Калі народ прымушалі замаўчаць, то найперш ягоныя ворагі імкнуліся зьнішчыць помнікі, заглушыць народную памяць, прадставіць яе ў скажоным сьвятле. Усё ж не перарвалі народную традыцыю самыя страшныя буры ваенных падзеяў на беларускай зямлі. Шмат загінула ў войнах і пажарах, але лепшыя сыны-патрыёты ў гарадох, мястэчках і нават у вёсках па магчымасьці ўзнаўлялі страчанае, і боязь новай страты рухала рамантыкаў у пошукі кімсьці вывезеных нацыянальных каштоўнасьцяў.

Тут вялікая гісторыя саміх пошукаў, музэйнага калекцыянаваньня і аховы помнікаў. Многае патрабуе новых дасьледаваньняў у гэтай справе.

Заглыбляючыся ў стагодзьдзі, высьвятляючы непарыўны ланцужок традыцыі аховы раньніх помнікаў, дойдзем да імя асьветніцы Эўфрасіньні Полацкай, якая, перапісваючы летапісы, множыла іх, ратавала ад забыцьця. І ў Кірылы Тураўскага жыло пачуцьцё зацікаўленага асьветніка ў захаваньні матэрыяльных і духоўных каштоўнасьцяў.

У сярэднявеччы ў абарону помнікаў народа падаў голас беларускі паэт Андрэй Рымша ў паэме „Дзесяцігадовая аповесьць пра ваенныя справы Крыштафа Радзівіла . . . (Вільня, 1585), што пасылаў праклён рыцарам, ад рук якіх прахам ішло ўсё створанае розумам і працай людзей. Гінуць жа было чаму. Тады цэнтрамі актыўнага культурна-асьветніцкага дзеяньня, творчай думкі былі Магілёў, Полацак, Вільня, Вітэбск, Менск, Смаленск, Гародня, Нясьвіж, Слуцак, Наваградак, Берасьце, Лагойск, Слонім і інш., нават у меншых гарадох і „сяльцох", як Заслаўе, Гальшаны, Радашкавічы, Ліда, Баркулабава, Любча, Лоск, Супрасль, Хоўхлава, Забель, Шчорсы, Быхаў, дзе працавалі школы, ствараліся і ахоўваліся летапісы і кронікі, меліся бібліятэкі, а ў некаторых месцах адчыняліся „скарбцы", „нумізматычныя габінэты", мастацкія калекцыі. Так, з XYI стагодзьдзя пры Нясьвіжскім замку пачаў фармавацца важны дзяржаўны архіў. А першым сьвядомым калекцыянерам помнікаў культуры Беларусі стаў Мікалай (Сіротка) Радзівіл (1949–1616), які істотна папоўніў нясьвіжскую скарбніцу, далучыўшы сюды творы мастацтва, кніжныя фаліянты, манускрыпты. Нясьвіж стаў важным дзяржаўным сховішчам дакумантаў. Асобае мейсца ў замку займала галерэя мастацкіх палотнаў, дзе, акрамя даўніх твораў італьянскага, французкага, галяндзкага, гішпанскага жывапісу, былі работы мяйсцовых майстроў. Да каштоўнасьцяў закрытай экспазіцыі Радзівілаў маглі даступіцца толькі вяльможныя асобы. Тут знаходзіліся старажытныя гэрбы, граматы на пэргамэнтах, а таксама маршальскія жэзлы, гэтманскія булавы, рыцарскія аблачэньні вояў, наборы сагнэтаў, іншыя рэдкасныя ювэлірныя вырабы з манаграмамі, партрэты гаспадароў двара. Выключную каштоўнасьць мелі шкатулы з 12 952 нумізматычнымі знакамі, кожнаму зь якіх было адведзена мейсца.

(Працяг на 4-й стар.).

## Справа слушная, актуальная

*З вялікім задавальненьнем прачытаў Вашу газэту. Усе матэрыялы цікавыя. Асабліва артыкул Я. Барэйкі „425-я ўгодкі беларускай пошты", інфармацыя „Маркі Слуцкага паўстаньня". Артыкул Ул. Цярохіна ўзнімае важнае пытаньне пра стварэньне Музэя гісторыі Беларусі. Цяпер, калі Вярхоўным Саветам рэспублікі абвешчаны суверэнітэт, узьнікае рэальная магчымасьць узнавіць сапраўдную гісторыю Беларусі, бяз белых і чорных плямаў.*

*Я жыву непадалёк ад так званага Дзяржаўнага музэя БССР. Часта наведваю яго з сынам. Цалкам згодны з усім напісаным і хачу дадаць, што наша гісторыя ў сучасным музэі дэпэрсаналізаваная, не згадваюцца многія дзяржаўныя дзеячы, палкаводцы, навукоўцы, пісьменьнікі. Мала арыгінальных экспанатаў, вялікая колькасьць муляжоў. Надзвычай бедна прадстаўленыя калекцыі халоднай зброі, нумізматыкі, практычна няма ордэнаў і мэдалёў перыядаў знаходжаньня Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай і Расейскай імпэрыі.*

*Як адзін з магчымых варыянтаў прапаную разьмясьціць новы музэй ў Верхнім Горадзе. Зараз, калі рэканструкцыя гэтага раёну яшчэ практычна не пачалася, ня позна знайсьці тут мейсца і для музэя. А ў старым будынку адкрыць асобны музэй – Музэй прыроды Беларусі.*


*Упэўнены, народныя дэпутаты Вярхоўнага Савету БССР, асабліва тыя, якія галасавалі за сувэрэнітэт рэспублікі, падтрымаюць ідэю стварэньня Музэя гісторыі Беларусі.*

*Вячэслаў СІЎЧЫК, г. Менск.*


## Аршанскае «ВЯРТАННЕ»

*„Дняпроўскія галасы" – у вянок памяці Уладзіміра Караткевіча – пісьменніка, Чалавека, земляка, звестуна беларускага нацыянальнага адраджэньня". Такі надпіс зроблен на тытульным лісьце паэтычнага зборніка „Вяртанне", які склалі вершы аршанскіх паэтаў. Кніжачка выдадзена ў Аршанскай друкарні летась, да 60-годдзя Ул. Караткевіча, накладам 990 асобнікаў і ўжо стала рэдкасьцю. Дарэчы, гэта першае ў Воршы літаратурнае выданьне пасьля „Маладняка" 20-х гадоў.*

## Даўнейшыя аршанскія паштоўкі



Куцеінскі Успенскі жаночы манастыр. Паштоўка пачатку XX ст.









Арыгінальная паштоўка XX ст. у выглядзе паштовага пераводу.

# СТАРЫЯ БЕЛАРУСКІЯ МУЗЭІ

*(Працяг. Пачатак на 3-й стар.).*

Нясьвіжскія калекцыі настолькі разрасьліся, што ствараліся новыя ў Алыцы, Клецку, Міры, Лідзе, Давыд-Гарадку, дзе працавалі ўласныя гісторыёграфы і архіварыюсы.

У XYII–XYIII стагодзьдзях у Нясьвіжы арганізавалася першая на Беларусі збраёўня, своеасаблівы музэй зброі. Выробленыя беларускімі майстрамі творы вайсковага прызначэньня былі проста ўнікальнымі. Кожная гармата збраёўні мела сваю назву: „Хімера", „Гідра", „Цэрбер", „Папугай", „Дракон" і г. д., і кожная упрыгожвалася рознымі карункамі, так што ўражаньне ад наведваньня гэтага музэя было надзвычай захапляючым. Колькасьць і разнастайнасьць калекцыі зброі і па сёньня не пераўзыдзена на Беларусі.

Дайшлі зьвесткі і пра археалягічную калекцыю ў Нясьвіжы, хутчэй за ўсё выпадковых знаходак каменных прыладаў працы.

Да XIX стагодзьдзя нясьвіжская рэзыдэнцыя ў пэўнай меры заставалася недатыкальнай, а музэйныя зборы амаль нечапанымі. Ужо пасьля далучэньня Беларусі да Расеі па другім падзеле Рэчы Паспалітай частка нясьвіжскіх калекцыяў была вывезеная ў Пецярбурсгкую акадэмію навук, дзе да 1842 года ўсё ляжала някранутым, нават нераспакаваным. А яшчэ пазьней беларускія рэліквіі зь Нясьвіжа падзялілі паміж сабою Акадэмія навук, Духоўная акадэмія і Маскоўскі ўнівэрсытэт.

З выпадку вайны 1812 года, па загаду генэрала Чыгалава, трынаццаць вазоў нагрузілі прадметамі з нясьвіжскіх збораў, вядома ж, пад вельмі прыстойнай падставай – захаваць ад французаў. А як аказалася на справе, тая „бясьпека" каштавала надта дорага, толькі амаль праз сто гадоў, у 1907 годзе, Радзівілы дабіліся вяртаньня часткі сваіх калекцыяў. Другая частка трапіла ў бібліятэку Красінскіх у Кракаў. Былі ж там рукапісныя кнігі і стадрукі XYI–XYII стагодзьдзяў, а таксама габелены, жывапіс і многае іншае.

Асобнае мейсца ў гісторыі музэйнай справы будзе займаць музэй пры Полацкай езуіцкай Калегіі, якая пасьля вайны 1812 года рэарганізаваная ў акадэмію. Музэй ствараўся да 1780 года, а адчыніўся ў 1787 годзе. Ён таксама быў музэем закрытага тыпу, для выкладчыкаў і навучэнцаў. Аднак жа нельга адносіць яго да прыватных установаў. Тут захоўваліся архіў акадэміі, працы выкладчыкаў. Адна з іх па археалёгіі краю нядаўна трапілася аўтару гэтай публікацыі ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР. У музэі захоўваліся і рукапісы старажытных актаў. Магчыма, што ў гэтай калекцыі тады быў Полацкі летапіс, пра зьмест якога цяпер можна меркаваць толькі па кнізе гісторыка В. Тацішчава. Былы царскі генэрал і літаратар А. Жыркевіч частку Полацкага архіва адшукаў у Сімбірску падчас першай сусветнай вайны. Зноў жа нібы ратавалі ад пажару вайны, а там з цэхгаўза гандляры цягнулі на рынак і прадавалі на пуды ў якасьці паперы для абгорткі. Частку манускрыптаў без усякіх рэестраў Жыркевічу ўдалосоя выкупіць і перадаць на захаваньне ў Сімбірскі архіў. Шмат жа той гістарычнай спадчыны так навекі і застанецца непрачытанай, незасвоенай. Ад полымя вайны засьцераглі, а ад „унутраных туркаў" – не.

Вядома, што Полацкая акадэмія была рэарганізаваная ў піярскую вучэльню, але і гэты рэфармацыйны акт ня выратаваў яе ад поўнае ліквідацыі. У 1830–1831 гадох вяршыўся акт не толькі закрыцьця, але й спусташэньня яе „культурнага цяпельца" – музэя. Адукаваныя вандалы з Пецярбурга й Масквы, як пасьля пажару, хапалі полацкія каштоўнасьці. Папячыцель Беларускае навучальнае акругі В. Карташэўскі даводзіў, што бібліятэку і музэй у Полацку трэба пакінуць, бо непараўнальна цяжка іх тут арганізоўваць. І ўсё ж, кіруючыся ўказаньнямі пецярбургскага прафэсара Папова, іх проста такі разрабавалі.

Лепшыя творы мастацтваў былі накіраваныя для Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. У паштовым рэестры зафіксаваныя дзьве скрыні па 160 перагародак, кожная з унікальнымі калекцыямі і яшчэ дзьве скрыні з карцінамі ды тры з сонечным гадзіньнікам вельмі рэдкай работы, антыкварыятам прадметаў культу . . . У гэтым абозе пакідалі Беларусь і 256 пудоў (4 096 кг) кніг, і, здаецца, ніводная з іх не вярнулася ані ў Полацк, ані ў Менск, ані ў Гародню, ані ў які іншы горад Беларусі. Не забудзем, што і ў XYIII стагодзьдзі адсюль невядомымі рабаўнікамі былі адпраўлены ў Рыгу каля 300 пудоў рукапісных кніг, а яшчэ столькі ж у Крулевец (сучасны Калінінград). Так аскуджаўся духоўны фонд народа, якому злыдні розных масьцёў маглі кінуць у вочы як зьдзек: „А што вы, беларусы, маеце?".

Багатая гісторыя музэяў Беларусі, і яе вывучэньне толькі пачынаецца. Нязначная колькасьць публікацыяў і першых кніг дае падставы меркаваць, што тут чакаюцца цікавыя адкрыцьці, а значыцца ўзбагаціцца гісторыя нашае матырыяльнае й духоўнае спадчыны. Нават ужо з тых зьвестак, якія мы маем, упамінаньне такіх культурных цэнтраў, як Шчорсы, адразу ж выклікае ўяўленьне пра ўнікальную бібліятэку, якой карысталіся астраном М. Пачобут, гісторыкі І. Ярашэвіч, І. Даніловіч, М. Маліноўскі, паэты А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, раманіст Ю. Крашэўскі. Былі тут і мастацкая галерэя і архіўныя дакументы. Мэцэнатам гэтых каштоўнасьцяў быў уладальнік Шчорсаў Іяхім Храптовіч (1729–1812), вядомы асьветнік і грамадскі дзеяч. Ягоны сын Адам Храптовіч (1768–1844) значна пашырыў зьбіральніцка-музэйную работу. Калі бацька у Вішневе (сучасны Валожынскі раён) толькі пачынаў закладаць першыя калекцыі, то сын іх значна папоўніў, закладваючы тут асновы краязнаўства. На жаль, наступныя ўладальнікі каштоўнасьцяў у Шчорсах і Вішневе праяўлялі меншы клопат, што ў рэшце рэшт і прывяло да зьнікненьня адсюль унікальных калекцыяў.

Шмат цікавага захоўвалася ў прыватнаўласьніцкіх музэях Ружанах (зараз Пружанскі раён), дзе быў створаны так званы „Сапежынскі збор". Заснавальнікам калекцыі старадаўніх прадметаў у Гомелі быў М. Румянцаў (1754–1826), які арганізоўваў спэцыяльныя экспэдыцыі па збору археалягічных, археаграфічных, этнаграфічных, нумізматычных і іншых матэрыялаў. Многія матэрыялы з ягоных збораў пазьней увайшлі ў фонды маскоўскае бібліятэкі і Пецярбургскага так званага Румянцаўскага музэя.

Невядома, дзе зараз адрасы калекцыяў мяйсцовых музэяў, якія закладваліся пры дварох у Беніцы (каля Маладэчна), у Накрышках пад Наваградкам, у Дабраўлянах, на поўнач ад Смаргоні, у Бяльмонтах пад Браславам, у Гародні. У Замосьці багаты музэй стварыў вядомы беларускі краязнавец Аляксандр Ельскі. Рэдкія нумізматычныя калекцыі манэтаў і цэлых скарбаў сабраў граф Чапскі ў сваім радавым маёнтку Станькава каля Койданава.

*(Заканчэнне будзе ў наступным нумары).*

# СЛОВА ДА ЧЫТАЧОЎ

*Шаноўныя калегі! Вы трымаеце ў руках другі нумар нашай газэты. Аргкамітэт Беларускага таварыства калекцыянераў з прыемнасцю паведамляе, што ідэя стварэння таварыства знайшла сваіх прыхільнікаў. Прынамсі, на сёньняшні дзень мы атрымалі 25 лістоў, дзе ўхваляецца гэта задума. Ужо вядзецца праца над праектам Статута таварыства, і дзесьці бліжэй да лета мы плануем першую сустрэчу ўсіх зацікаўленых асоб. Мы таксама звяртаемся да нашых мастакоў дапамагчы стварыць эмблему таварыства. Пераможца будзе адзначаны грашовай прэміяй.*

*Да нас шмат хто звяртаецца з просьбай падпісаць на нашу газэту, але, на жаль, зрабіць гэта мы не можам, бо няма цвёрдай гарантыі перыядычнасці выхаду яе. Але ўсіх тых, хто хоча атрымліваць нашу газэту (акрамя мінчукоў), мы просім даслаць на адрас рэдакцыі свой падрабязна адрас і грашовы перавод на 4 рублі. У Менску нашу газэту можна набыць у ТБМ (Таварыстве беларускай мовы) ці замовіць у рэдакцыі газэты „Свабода".*

*Усе матэрыялы, а таксама фотаздымкі для публікацыі просьба дасылаць у двух асобніках. Матэрыялы павінны быць надрукаваны на машынцы праз два інтэрвалы. Усю адказнасць за змешчаны матэрыял нясуць іх аўтары.*

*Чакаем вашых допісаў, прапаноў, парад.*

## Аб'явы

*Зьбіраю беларускія медалі, значкі, маркі. Набуду на любых умовах значок „Участнику строительства железной дороги Срша–Лепель" 1925 года. Цікаўлюся бонамі беларускіх гарадоў. Маю абменны фонд.*

*211030, м. Ворша, Флёрава, 7–16. Алесю Сярожкіну.*

x x x

*Кожную нядзелю, а 14 гадзіне, каля крамы „Філятэлія" па вуліцы Міру, 59, зьбіраецца аршанскія калекцыянеры: нумізматы,, фалерысты, філятэлісты. Запрашайма на сустрэчы.*

x x x


*Зьбіраю беларускія латарэйныя квіткі. Зьвяртацца на адрас рэдакцыі, Новікаву Мікалаю.*

x x x

*Аргкамітэт Беларускага таварыства калекцыянераў зьвяртаецца да мастакоў, кааператараў, усіх тых, хто займаецца вырабам памятных і сувенірных значкоў і медалёў, з просьбай дасылаць па два пасобнікі на адрас аргкамітэту. Пажадана паведамляць наклад, прозьвішча мастака і месца вырабу медаля ці значка. Па жаданьню вытворцаў можа быць дадзена рэкляма іх вырабаў.*

x x x

*Набуду памятныя медалі: у памяць 700-годдзя Магілёва; 900 год Мінску; у памяць аб геройчнай абароне Брэсцкай крэпасьці 1965 г.; вэтэрану працы, мінскі фарфоравы завод; 25 год Беларускаму дзяржаўнаму тэатральна-мастацкаму інстытуту, 1970 г. Зьвяртацца на адрас рэдакцыі, Савіцкаму Антону.*




Бона места Слуцак.

„Беларускі калекцыянер" – орган Арганізацыйнага камітэту Беларускага таварыства калекцыянераў.

*Аршанская друкарня. Заказ № 4500*

*АДРАС ДЛЯ ЛІСТАВАНЬНЯ: 211030, места Ворша, вул. Флёрава, д. 7, кв. 16. Сярожкіну Алесю Міхайлавічу.*

Кошт 60 капеек.

Наклад 990 асобнікаў.
Нумар рыхтавалі А. СЯРОЖКІН і Ул. ЦЯРОХІН.
Здымкі А. ШЫНКЕВІЧА.